УДК 316.6

# НАВУЧАННЕ СУПРАЦЬДЗЕЯННЮ МОЎНАМУ МАНІПУЛІРАВАННЮ Ў МЕДЫЯ

***С. В. Венідзіктаў***
*УА «Магілёўскі інстытут Міністэрства*
*ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь»,*
*начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

Развіццё адукацыйнага асяроддзя ва ўмовах інфарматызацыі, лічбавізацыі, медыятызацыі сучаснага грамадства непазбежна накладвае адбітак на змест і характар навучальнага працэсу, а таксама абумоўлівае новыя патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый сучаснага спецыяліста. Незалежна ад профілю канкрэтнай навучальнай установы, спецыяльнасці (спецыялізацыі) і ўзроўню атрымання адукацыі ў сістэме фарміруемых «мяккіх» навыкаў прысутнічае медыяінфармацыйная граматнасць (здольнасць асобы да засваення прадукцыі медыя, разумення яе сацыяльнага, палітычнага, культурнага, ідэалагічнага кантэксту ў сувязі з кантэкстам функцыянавання сродкаў масавай камунікацыі), якая, у сваю чаргу, звязваецца з развіццём інфармацыйнай культуры. Гэтая якасная характарыстыка існавання асобы ў прасторы масавай камунікацыі выяўляецца ў тыпе спажывання масавай інфармацыі, у яе стварэнні, мадыфікаванні, захоўванні, распаўсюджванні, што прадвызначае як агульную кампетэнтнасць спецыяліста, так і індывідуальны ўзровень інфармацыйнай бяспекі. Адной з найбольш відавочных пагроз у гэтай сферы з'яўляецца спажыванне прадукцыі сродкаў масавай камунікацыі, якая змяшчае скажоную інфармацыю, што, у сваю чаргу, можа прывесці да стварэння ў аўдыторыі скажонай карціны рэчаіснасці і справацыраваць неадэкватныя праявы сацыяльнай актыўнасці (т. зв. «каляровыя рэвалюцыі» з'яўляюцца найбольш відавочным, але не адзіна магчымым іх прыкладам).

Скажэнне масавай інфармацыі можа прымаць розныя формы: ад адкрытага фабрыкавання фактаў (мае выгляд фактоідаў, «псеўданавін», фэйкаў і г. д.), няслушнай расстаноўкі акцэнтаў, стварэння недакладнага візуальнага кантэнту (напрыклад, дыпфэйкаў) да схаванага ўплыву на ўспрыманне аўдыторыі праз выкарыстанне маўленчых канструкцый, якія карэкціруюць існуючыя або ствараюць ілжывыя сэнсы. Маўленчыя формы маніпуліравання свядомасцю масавай аўдыторыі з'яўляюцца найбольш даступнымі для супрацоўнікаў СМІ (не патрабуюць дадатковых тэхнічных і тэхналагічных рэсурсаў) і, адпаведна, найбольш распаўсюджанымі ў медыядыскурсе. У той жа час, выяўленне іх базавых тэхнік

магчыма нават пры сярэднім узроўні лінгвістычнай і камунікатыўнай падрыхтоўкі, прадугледжанай адукацыйнымі стандартамі вышэйшай адукацыі.

Мяркуем, што для фарміравання кампетэнцый, неабходных для самастойнага маніторынгу навучэнцамі прадукцыі СМІ на прадмет маўленчага маніпуліравання, у навучальныя планы ўстаноў вышэйшай адукацыі не абавязкова ўключаць асобныя дысцыпліны. Напрыклад, наш вопыт выкладання дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыклу ў Магілёўскім інстытуце Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь сведчыць аб магчымасці ўключэння медыяадукацыйных элементаў у камунікатыўныя, лінгвістычныя і іншыя дысцыпліны.

Маўленчае маніпуліраванне ў міжасабовай камунікацыі курсанты Магілёўскага інстытута МУС вывучаюць у рамках дысцыпліны «Рыторыка» (І курс навучання). Пры гэтым ілжывыя аргументы, апеляцыя да пачуццяў аўдыторыі, сафізмы і іншыя прыёмы ўвядзення суразмоўцы ў зман змяшчаюцца намі ў шырокі кантэкст і разглядаюцца, у тым ліку, праз аналіз публікацый у рускамоўных СМІ.

Дысцыпліна «Прафесійная этыка», якая вывучаецца паралельна, таксама прадугледжвае работу курсантаў (як аўдыторную, так і самастойную) па аналізе медыякантэнту, прысвечанага праваахоўнай дзейнасці. Прыклады тэкстаў для аналізу (на рускай і беларускай мовах) уключаны ў электронныя вучэбна-метадычныя комплексы, а таксама ў навучальныя дапаможнікі па адпаведных дысцыплінах. Акцэнт на супярэчнасцях паміж рэальнай карцінай рэчаіснасці і яе адлюстраваннем у СМІ, а таксама на прычынах гэтых супярэчнасцей дазваляе сфарміраваць у навучэнцаў устаноўку на неабходнасць самастойнага рэфлексіўнага скарыстання прадукцыі медыя.

У вучэбныя планы спецыяльнасцей «Прававое забеспячэнне грамадскай бяспекі» і «Прававое забеспячэнне аператыўна-вышуковай дзейнасці» ўключана дысцыпліна «Інтэрнэт-камунікацыя ў дзейнасці органаў унутраных спраў» (ІІ курс навучання), адной з задач якой з’яўляецца фарміраванне медыйнай культуры курсантаў, іх здольнасці да аналізу сеткавага кантэнту, павышэнне ўстойлівасці да маніпуляцый у медыя. Напрыклад, у межах тэмы «Верыфікацыя інфармацыі» вывучаюцца найбольш распаўсюджаныя ў інтэрнэт-крыніцах спосабы скажэння масавай інфармацыі, а таксама аналізуюцца алгарытмы выяўлення фэйкавых паведамленняў на ўзроўні тэкстаў і візуальных вобразаў. Тэма «Інфармацыйная культура і інфармацыйная бяспека асобы» дазваляе разгледзець крытычна важныя для сучаснага спажыўца мэдыякантэнту аспекты медыйнай граматнасці ў кантэксце задачы развіцця агульнай інфармацыйнай культуры — якаснай характарыстыкі існавання асобы ў прасторы масавай камунікацыі, якая выяўляецца ў тыпе скарыстання масавай інфармацыі, у яе стварэнні, захоўванні,

распаўсюджванні. Навыкі выяўлення маўленчых маніпуляцый намі разглядаюцца ў якасці элементу лічбавай гігіены і больш шырока — як індывідуалізаваная прылада процідзеяння дэструктыўнаму інфармацыйнаму ўплыву.

На ўзроўні перападрыхтоўкі (факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў) прадугледжана вывучэнне дысцыпліны «Сувязі з грамадскасцю ў дзейнасці органаў унутраных спраў». Тут дзеючым супрацоўнікам прапануецца самастойна праводзіць аналіз медыйных тэкстаў праваахоўнай тэматыкі і выяўляць як выпадкі скажэння інфармацыі, так і стратэгіі маўленчага маніпуліравання. У якасці базавых прыкмет дэзінфармацыі прапануецца разглядаць адсутнасць спасылак на першакрыніцу; выкарыстанне ананімных, нефармальных крыніц; акцэнт на тым, што важная інфармацыя ўтойваецца ад аўдыторыі; наяўнасць аўдыявізуальнай інфармацыі, якая супярэчыць тэкставай; апеляцыя да эмоцый аўдыторыі. У навучальны дапаможнік па адпаведнай дысцыпліне таксама ўключаны матэрыялы са сродкаў масавай інфармацыі і іншых сеткавых крыніц, прызначаныя для самастойнага аналізу навучэнцамі з мэтай выяўлення маніпуліравання аўдыторыяй.

У рамках праграм павышэння кваліфікацыі (факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў) прадугледжана вывучэнне раздзелаў, якія раскрываюць спецыфіку масавай інфармацыйнай дзейнасці ў сацыяльных сетках і фарміруюць у слухачоў навыкі самастойнага аналізу адпаведнага кантэнту. Напрыклад, раздзел «Ажыццяўленне маніторынгу старонак у сацыяльных сетках на наяўнасць негатыўнага кантэнту» ўключае правядзенне кантэнт-аналізу з мэтай выяўлення негатыўнай інфармацыі, а таксама канструіраванне сацыяльна-псіхалагічнага партрэта карыстальнікаў сацыяльных сетак на аснове іх маўленчага вобраза. Тут таксама разглядаюцца прычыны разыходжанняў у падачы інфармацыі праваахоўнага характару паміж сеткавымі выданнямі і нефармальнымі крыніцамі (групы, супольнасці), якія прэтэндуюць на эксклюзіўнасць і аператыўнасць.

Абагульненне нашага вопыту выкладання дысцыплін камунікатыўнага і прыкладнога лінгвістычнага профілю ў навучальнай установе сістэмы МУС ва ўмовах адсутнасці медыяспецыялізацыі і неабходнасці фарміравання медыйнай культуры курсантаў прыводзіць да высновы аб мэтазгоднасці вывучэння базавых тэхналогій маўленчага маніпуліравання (з улікам спецыфікі асобных дысцыплін і задач, што яны вырашаюць). Да такіх тэхналогій мы адносім наступныя: клікбейт-загалоўкі, лістыклы, метафарызацыю інфармацыі, ненатуральную эмацыянальнасць паведамленняў.

Клікбейт-загалоўкі (англ. clickbait ад click «пстрычка» + bait «прынада») — загалоўкавыя комплексы, у якія наўмысна ўнесены скажэнні, правакацыйна расстаўлены акцэнты для прыцягнення ўвагі аўдыторыі масмедыя — разглядаюцца намі пры вывучэнні спецыфікі распаўсюджвання інфармацыі ў інтэрнэце і пры аналізе публікацый, якія закранаюць дзейнасць праваахоўных структур [1, с. 106].

Самастойная работа курсантаў і слухачоў па аналізе медыякантэнту дазваляе выявіць элементы клікбейта як у інфармацыйных рэсурсах, якія не адносяцца да катэгорыі СМІ, так і ў агульнапалітычных выданнях. Акцэнт пры гэтым робіцца на набыцці навучэнцамі навыкаў рэфлексіўнага ўспрымання загаловачных комплексаў з выяўленнем магчымага маніпулятыўнага ўздзеяння праз:

а) інтрыгуючы характар («Раскрыты ўнікальныя падрабязнасці гучнай справы…»);

б) выкарыстанне займеннікаў другой асобы (ты, вы), якія ствараюць ілюзію дыялогу з рэцыпіентам («Метады заробку, пра якія вы не чулі…»);

в) выкарыстанне знакаў мадальнасці («Як правільна строіць зносіны з участковым? );

г) гіпербалізацыю і залішнія эпітэты («Сапраўднае злачынства стагоддзя здзейснена ў сталіцы…»);

д) спасылкі на шакіруючы візуальны кантэнт («Апублікаваныя фатаграфіі з месца аварыі (увага: шакіруючыя кадры)»);

е) абяцанне атрымання выгады праз доступ да эксклюзіўнай інфармацыі («Названы спосаб законна не плаціць штрафы», «Беларусам распавялі, як гадамі не плаціць за арэнднае жыллё»).

Лістыклы (ад англ. listicle — «артыкул-спіс», «пералік», вытворнае ад list — «спіс», article — «артыкул») уяўляюць сабой адносна новы метад маніпуліравання ўвагай аўдыторыі медыя праз выкарыстанне прыёмаў лагічнай і кампазіцыйнай арганізацыі тэкстаў. Падобная моўная форма маніпуляцыі досыць проста паддаецца фармальнай дыягностыцы, уяўляючы сабой маркіраваны спіс, які раскрывае змест загалоўку (загаловак утрымлівае ўказанне на колькасць пунктаў у матэрыяле і на вырашаемую ў ім праблему) [2, с. 208–209]. Прыклады падобных загалоўкаў: «5 спосабаў зарабіць на запісах з відэарэгістратара», «7 самых загадкавых злачынстваў сучаснасці», «Топ-9 міліцэйскіх аўто ў Расіі», «15 фэйкаў пра міліцыю, якім вы паверылі» і да т. п. (колькасць пунктаў у спісе, як правіла, не перавышае 20 і з’яўляецца няцотнай). Дзейнасць гэтага метаду маніпуліравання заснавана на асаблівасцях успрымання арганізаванай у прасторы тэкставай інфармацыі: такі матэрыял у цэлым засвойваецца нерэфлексіўна.

Метафарызацыя інфармацыі як метад маўленчага ўздзеяння на свядомасць аўдыторыі патрабуе больш дэталёвага разгляду ў рамках аўдыторных заняткаў па гуманітарных дысцыплінах. Гэты метад заснаваны на паступовым укараненні ў медыядыскурс сістэмы метафар (вобразных выразаў, якія змяшчаюць адсылку да штучна канструіруемых маніпулятарам характарыстык аб'екта або з'явы), якія фарміруюць скажонае ўяўленне аўдыторыі аб тых ці іншых аспектах сацыяльнай рэальнасці. Выкарыстанне метафар асабліва характэрна для публіцыстычных тэкстаў агітацыйнай скіраванасці перыяду вострых палітычных або сацыяльных трансфармацый, аднак сустракаецца і ў сучасных матэрыялах прааахоўнай тэматыкі (выразы тыпу «пярэваратні ў пагонах», «людзі ў масках» і да т. п.).

Можа служыць формай маўленчага маніпуліравання таксама ненатуральная эмацыянальнасць паведамленняў. Яе маркерамі выступаюць багацце эпітэтаў, вобразных параўнанняў, алегарычных выразаў, эмацыянальна афарбаваных слоў (выкарыстоўваюцца адпаведныя марфемы) і інш. [3]. Такія канструкцыі нацэлены на ўздзеянне на сферу несвядомага, абыходзячы этап крытычнага асэнсавання ў сітуацыі недастатковай аргументацыі і прабелаў у лагічнай пабудове тэкстаў.

Такім чынам, лінгвістычныя і камунікатыўныя дысцыпліны валодаюць адпаведным патэнцыялам фарміравання ў навучэнцаў кампетэнцый выяўлення і супрацьдзеяння маўленчаму маніпуліраванню ў медыя. Ва ўмовах адсутнасці спецыялізаваных курсаў па медыйнай граматнасці яны кампенсуюць прабелы ў развіцці «мяккіх» навыкаў аптымальнага (і прафесійна арыентаванага) інфармацыйнага спажывання. Разгляд дысфункцыянальных з'яў у СМІ і развіццё ўстаноўкі на рэфлексіўнае скарыстанне кантэнта розных тыпаў выданняў становіцца як неабходным элементам лічбавай гігіены, так і фактарам гарантавання інфармацыйнай бяспекі на індывідуальным узроўні.

1. Венидиктов С. В. Искажение медиареальности : технологии манипулирования и стратегии противодействия : моногр. Могилев : Могилев. ин-т МВД, 2022. 192 с. Вярнуцца да артыкула

2. Богданова Д. А. Кликбейты и листиклы — современные приемы подачи информации онлайновыми медиа // Нар. образование. 2019. № 4. С. 203–210. Вярнуцца да артыкула

3. Венидиктов С. В. Кликбейт-заголовки «негативных» новостей правоохранительной тематики [Электронный ресурс] // Языковая компетентность: методические аспекты практико-ориентированного образования : сб. науч. ст. ; редкол.: С. В. Венидиктов (отв. ред.) [и др.]. Могилев : Могилев. ин-т МВД, 2020. 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). Вярнуцца да артыкула